Стралец М.В., Старыкаў В.І.

# БРЭСЦКАЯ ЯЎРЭЙСКАЯ СУПОЛКА НАПЯРЭДАДНІ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Напярэдадні другой сусветнай вайны яўрэі складалі самую вялікую па колькасці нацыянальна-этнічную і рэлігійную групу горада, а менавіта - 41,3 працэнта.

Яны займалі значнае месца у эканамічным жыцці горада. Яўрэі працавалі амаль ва усіх сферах вытворчасці, аптовага і дробнага гандлю, усіх відаў раместваў.

Сярод гараджан, якія займаліся фізічнай працай, рамяством, гэта этнічная група складала 80,3 працэнта. Абсалютная большасць рамеснікаў, дробных вытворцаў, сталяроў, краўцоў, кавалеў, бляхароў, шаўцоў, маляроў, цесляроў, рымароў былі яўрэямі.

Шмат прадстаўнікоў гэтага народа валодала аптовымі базарамі, магазінамі, складамі, фабрыкамі. Напрыклад, яўрэйскага гаспадара мелі 65 майстэрань з 110, 429 магазінаў з 541,77 баз з 82 і г.д.

Этнічны склад органаў самакіравання сведчыў пра дыскрымінацыю яўрэяў. Іх не было ў судзе, пракуратуры, паліцыі, ваеннай камендатуры, у органах асветы, на пошце, на тэлеграфе, на чыгунцы, у лясніцтве, у банку, у сферы дзяржаўнай манаполіі на водку.

Важна адзначыць, што брэсцкая яўрэйская суполка мела сваю этнічную свядомасць, захавала ідышыскую культуру. Вернікі задавальнялі свае рэлігійныя патрэбы ў 4 сінагогах, малітвенных хатах.

Пры размове аб сінагогах добра прасочваецца сувязь гісторыі і сучаснасці. На працягу некалькі апошніх гадоў брэсцкія яўрэі актыўна патрабуюць ад улад вяртання ім сінагогі. Але гэта пытанне так і застаецца невырашаным.

У Брэсце існавала шмат яўрэйскіх грамадскіх і палітычных арганізацый.

На яўрэйскай мове выходзіла газета "Полешер найес" ("Палескія навіны").

* * *

**Еврейская нация дала миру много великих людей. Среди них трое особенно знамениты: Христос дал веру, Маркс дал надежду, а Эйнштейн доказал, что и то и другое — относительно.**